*УДК 364.22*

# АЦЭНКА БЕДНАСЦІ ЯК КРЫТЭР ЭФЕКТЫЎНАСЦІ ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ

***М. С. Мамекін***

*Магістр паліталогіі, выкладчык кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ,г.Мінск, Беларусь*
*MamekinMS@bsu.by*

Публікацыя прысвечана аднаму з прыярытэтных напрамкаў сучаснага дзяржаўнага кіравання – змаганню з беднасцю. Праведзены аналіз методыкіпадыходаўдаацэнкігэтай сацыяльнай з’явы, а таксама разгледжана афіцыйныя методыкаацэнкі ўзроўня беднасці насельніцтва ў Рэспубліцы Беларусь.

***Ключавыя словы:*** беднасць насельніцтва; узровен ьжыццянасельніцтва; пражытковы мінімум; дэпрывацыя; адносная беднасць; абсалютная беднасць; методыка ацэнкі.

***M. S. Mamekin***

*Master of Political Science, Lecturer, Department of Political Science, Faculty of Law, BSU, Minsk, Belarus*
*MamekinMS@bsu.by*

The publication is dedicated to one of the priorities of modern public administration - the fight against poverty. The analysis of methods of approaches to assessment of this social phenomenon is carried out, and also the official methods of assessment of the level of poverty of the population in the Republic of Belarus are considered.

***Keywords***: poverty; living standards; subsistence level; deprivation; relative poverty; absolute poverty; evaluation methodology.

Феномен беднасці як сацыяльна-эканамічнай з'явы мае працяглую гісторыю вывучэння. Ад антычных філосафаў, якія звярталіся да праблем сацыяльнай няроўнасці, сацыяльнай стратыфікацыі грамадства, ідэальнага яго ўладкавання, сацыяльнай справядлівасці, да прац Сміта, Мальтуса, Маркса і інш. Шматвяковая гісторыя вывучэння і даследавання беднасці як сацыяльна-эканамічнай з'явы тлумачыцца незвычайнай складанасцю гэтага феномену, што ў сваю чаргу нарадзіла вялікую колькасць трактовак гэтай з'явы. У агульным разуменні беднасць вызначаецца як сацыяльна-эканамічнае становішча часткі насельніцтва з узроўнем дабрабыту, недастатковым для годнага задавальнення фізіялагічных і духоўных запатрабаванняў з улікам нормаў і стандартаў, якія склаліся ў грамадстве, што ўключае ў сябе рознага роду пазбаўленні (дэпрывацыі) [1, с. 2].

Нягледзячы на адсутнасць адзінства падыходаў да разумення прычын і сутнасці беднасці як з'явы, сёння для любой дзяржавы барацьба з беднасцю з'яўляецца важнейшым прыярытэтам сацыяльнай палітыкі. Для ўстойлівага развіцця першараднае значэнне мае максімальнае скарачэнне ў краіне

ўзроўня малазабяспечанасці. І чым паспяховей будзе рэалізавана гэта задача, тым больш эфектыўнай можна лічыць дзяржаўную палітыку і кіраванне.

У Рэспубліцы Беларусь ацэнкабеднасці з 1995 г. ажыццяўляецца Нацыянальным статыстычным камітэтам Рэспублікі Беларусь на падставе дадзеных выбарачнага абследавання хатніх гаспадарак па ўзроўні жыцця.

Пры характарыстыцы ўзроўня беднасці насельніцтва адным з важнейшых пытанняў з'яўляюцца падыходы, якія выкарыстоўваюцца для яе ацэнкі. Так, па апошніх дадзеных, за рысай беднасці апынуліся 4,8% насельніцтва Беларусі [2]. Гэта азначае, што рэсурсы, якія яны маюць, менш за бюджэт пражытковага мінімуму, які цяпер у сярэднім на душу насельніцтва складае 258,11 рублёў.

У аснове афіцыйнай методыкі вымярэння беднасці ў Рэспубліцы Беларусь ляжыць абсалютная канцэпцыя беднасці, якая грунтуецца на ўсталяванні мінімальнага пераліку асноўных патрэбнасцяў (тавараў і паслуг) і памеру рэсурсаў, што патрабуюцца для іх задавальнення.

У якасці паказчыку даходаў насельніцтва для ацэнкі абсалютнай беднасці выкарыстоўваецца паказчык "рэсурсы, што маюцца", які ўключае грашовыя сродкі, кошт спажытых прадуктаў харчавання, выробленых у асабістай дапаможнай гаспадарцы, за мінусам матэрыяльных выдаткаў на іх вытворчасць, а таксама кошт атрыманых у натуральнай форме льгот і выплат [3].

Разам з тым, трэба ўлічваць, што ўзровень беднасці ацэньваецца на падставе менавіта выбарачнага апытання хатніх гаспадарак аб прыбытках і выдатках. Атрыманыя дадзеныя не заўсёды могуць быць дакладнымі. Напрыклад, людзі могуць хаваць частку сваіх прыбыткаў, атрыманых у нефармальным сектары, ці прыніжаць выдаткі на тавары і паслугі, што сацыяльнане ўхваляюцца. Таксама з апытанняў могуць выпадаць прадстаўнікі пэўных сацыяльных груп. Бо пры правядзенні апытання даследчыкі абыходзяць менавіта дамы, а гэта значыць, што ў выбарку не трапляюць, напрыклад, бяздомныя.

Па нашым меркаванні, абсалютная канцэпцыя беднасці з'яўляецца недастаткова аб'ектыўнай, паколькі лічыць беднымі толькі тых, хто мае даходы ніжэй за велічынюпражытачнага мінімуму, памылкова. Бюджэт пражытачнага мінімуму ў Рэспубліцы Беларусь, нягледзячы на яго сістэматычнае павелічэнне, вельмі невысокі і пражыць на працягу месяца на гэту суму досыць праблематычна. Такім чынам, неабходна аб'ектыўна ацэньваць сітуацыю і лічыць беднымі не толькі тых, хто маедаходы ніжэй за ўсталяваную велічынюпражытачнага мінімуму, але і тых, хто не можа весці годны лад жыцця з-за недахопу сродкаў да існавання.

Адносная канцэпцыя беднасці грунтуецца на параўнанні паказчыку "рэсурсы, што маюцца" не з мінімальнымі патрэбнасцямі, а з некаторым стандартам жыцця ці матэрыяльнай забяспечанасці, якія склаліся ў краіне. Адносная мяжабеднасці не прывязана да бюджэту пражытковага мінімуму. Гэта надзейны і зручны спосаб вызначэння груп насельніцтва і хатніх

гаспадарак, у якіх даход і спажыванне ніжэй, чым у асноўнай, найбольш шматлікай часткі грамадства.Пры ўжыванні такога падыходу ў Рэспубліцы Беларусь, калі ў якасці адноснай рысы беднасці выкарыстоўвацьвелічыню, роўную 60% ад медыяны сярэднедушавых рэсурсаў ,што маюцца, у сярэднім па рэспубліцы, разлічаных з улікам шкалы эквівалентнасці (па прыкладзе ЕС), то пры вымярэнні абсалютнай і адноснай мяжы беднасці паказчыкі адрозніваюцца.

Акрамя абсалютнай і адноснай беднасці на падставе дадзеных выбарачнага абследавання хатніх гаспадарак па ўзроўні жыцця вывучаецца суб'ектыўная беднасць. Пры гэтым суб'ектыўная канцэпцыя беднасці грунтуецца на двух падыходах ацэнкі хатнімі гаспадаркамі свайго матэрыяльнага становішча.

Першы падыход мяркуе ацэнку хатняй гаспадаркай узроўня сваіх даходаў на аснове супастаўлення з аб'ёмам рэсурсаў, неабходным для задавальнення патрэбнасцяў усіх членаў сям'і. У межах другога падыходу да катэгорыі бедных адносяцца хатнія гаспадаркі (яе члены), якія ацэньваюць сваё матэрыяльнае становішча праз параўнанне з забяспечанасцю іншых хатніх гаспадарак ці сваім становішчам у мінулым.

Таксама сведчаннем беднасці можа з'яўляцца недаступнасць шэрагу тавараў і паслуг. Дэпрывацыйная канцэпцыя беднасці дазваляе ацаніць беднасць не па даходах, што колькасна вымяраныя, а на аснове неграшовых крытэраў матэрыяльнага дабрабыту – па рэальных пазбаўленнях, якія выпрабоўвае хатняя гаспадарка, і ў выніку чаго з'яўляецца фактычна выключанай са звычайных умоў жыццядзейнасці.

Камбінаванне гэтых чатырох канцэпцый беднасці дазваляе ў значнай ступені ўдакладніць кантынгент беднага насельніцтва (хатніх гаспадарак), паколькі аднесці да бедных у гэтым выпадку можна асобаў ці хатнія гаспадаркі, якія адначасова адпавядаюць усім чатыром вышэйназваным крытэрам беднасці: бедныя па рэсурсах, што маюцца; бедныя адносна сярэдняга ўзроўня жыцця, які склаўся ў краіне; тыя, што адчуваюць сябе беднымі; тыя, хто выпрабоўвае дэпрывацыі.

Падводзячы вынікі, мы адзначаем, што беднасць сёння з'яўляецца адным з элементаў сацыяльнай рэчаіснасці. Нягледзячы на тое, што ў апошні час сістэма ўлады і кіравання надае значную ўвагу вырашэнню гэтага пытання, кардынальных змен не адбываецца. Ува многім для падвышэння эфектыўнасці палітыкі скарачэння ўзроўня беднасці насельніцтва неабходна дакладна ацаніць узровень беднасці насельніцтва. Менавіта таму перспектыўным напрамкам у галіне вымярэння беднасці ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца ўкараненне ў нацыянальную статыстычную практыку разліку індэксу шматмернай беднасці. Менавіта комплексны падыход у вывучэнні з'явы беднасці ў найбольшай ступені дазволіць вызначыць яе прычыны, а таксама стварыць сістэму процідзеяння беднасці, пабудаваную на прэвентыўных мерах, накіраваных на зніжэнне рызыкі беднасці і падвышэнне магчымасці самастойнага пераадолення матэрыяльных

цяжкасцяў, а таксама выкарыстоўваць меры прамой адраснай падтрымкі тых, у каго такіх магчымасцяў няма, а таксама тых, для каго развіццё і аднаўленне гэтых магчымасцяў каштуе вельмі дорага.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Методологическая практика государств – членов Евразийского экономического союза по формированию показателей, характеризующих уровень бедности [Электронный ресурс] // Евразийская экономическая комиссия. URL: http://www.eurasiancommission.org/ru/act/integr_i_makroec/dep_stat/econstat/Documents/Method/Poverty_Methodology.pdf). (дата доступу: 12.02.2021).

2. Распределение населения по уровню среднедушевых располагаемых ресурсов [Электронный ресурс] // Национальный статический комитет Республики Беларусь. URL: https://www.belstat.gov.by/ofitsialnaya-statistika/solialnaya-sfera/pravonarusheniya/anual_data/ (дата доступу: 12.02.2021).

3. Оценка бедности в Республике Беларусь: опыт, проблемы, перспективы [Электронный ресурс] // Национальный статический комитет Республики Беларусь. URL: https://clck.ru/TPXwH. (дата доступу: 12.02.2021).